# Год барацьбы за выкананне пастановы лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б)

Працоўныя нашай вялікай Радзімы сёння адзначаюць гадавіну з дня апублікавання гістарычнай пастановы лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

Вайна нанесла сур'ёзную шкоду нашай сельскай гаспадарцы. Яна прывяла да вялікіх матэрыяльных страт калгасаў, соўгасаў, МТС, аслабіла іх вытворчую базу, ўскладніла ўмовы іх развіцця Гэта прывяло да скарачэння пасеўных плошчаў, да агульнага зніжэння ўзроўню агратэхнікі, а значыцца, да памяншэння ўраджайнасці палёў, пагалоўя жывёлы і яе прадуктыўнасці.

Пасля вайны наша сельская гаспадарка аказалася перад неабходнасцю шырокіх аднаўленчых работ, дазваляючых адрадзіць яе даваенную магутнасць і рушыць далей справу яе ўздыму.

Адразу-ж пасля вайны ўрад прыняў меры да сур'ёзнага павелічэння выпуску сельскагаспадарчых машын і мінеральных угнаенняў для калгасных палёў, да хутчэйшага адраджэння сельскай гаспадаркі ў вызваленых раёнах.

Комуністычная партыя, дзякуючы генію вялікага Сталіна, знайшла шляхі хуткага ўздыму сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд. Прынятая ў лютым мінулага года пастанова Пленума ЦК ВКП(б) — ёсць бліскучая сталінская праграма адраджэння і далейшага пасляваеннага развіцця ўсёй соцыялістычнай сельскай гаспадаркі краіны. Як указваецца ў пастанове: «Пленум ЦК ВКП(б) надае першаступеннае значэнне справе хутчэйшага аднаўлення і ўздыму сельскай гаспадаркі, як неабходнай ўмове паспяховага развіцця ўсёй народнай гаспадаркі СССР і забяспечання далейшага палепшання матэрыяльнага добрабыту народа».

**В. ЛАБАНОК,**
**сакратар Палескага абкома КП(б)Б**

Чырвоны сцяг Совета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б.

Значныя дасягненні маюць у сваёй рабоце механізатары вобласці, якія не на славах, а на справе даказалі сваю кроўную зацікаўленасць ў падняцці культуры земляробства, скарачэнні тэрмінаў палявых работ, павышэнні ўраджаю. План трактарных работ выканан на 109,7 процанта. Сярэдняя выпрацоўка на 15-сільны трактар склала 404 гектары. Перадавая Хойніцкая МТС гадавы план трактарных работ выканала на 148,6 процанта. Тут сярэдняя выпрацоўка на 15-сільны трактар складае 609,7 гектара. Перавыкананы планы па ўсіх важнейшых відах работ. Калектыў гэтай машынна-трактарнай станцыі таксама трымае рэспубліканскі пераходны сцяг.

Такія-ж высокія вытворчыя паказчыкі маюць Брагінская, Рудакоўская, Ельская і МТС «20 год БССР». Усе яны перавыканалі свае планы ў строгім захаванні дагаворных абавязацельстваў з калгасамі.

Самаадданая праца палескіх калгаснікаў на палях не прапала дарэмна. Яна забяспечыла атрыманне высокіх ураджаяў, дазволіла нашай вобласці першай у рэспубліцы 28 жніўня выканаць дзяржаўны план хлебанарыхтовак. Створаны насенныя, страхавыя і фуражныя фонды, намнога ўзрасла аплата працадня, што павысіла жыццёвы ўзровень калгаснікаў.

За паспяховае правядзенне палявых ра-

Поспехі перадавікоў тлумачацца, у першую чаргу, высокім пачуццём доўга перад Радзімай, імкненнем праславіць сваю краіну, калгасны лад новымі дасягненнямі умацаваць ваенна-эканамічную магутнасць любімай Радзімы. Безумоўна, усе дасягненні калгаснага сялянства базіруюцца на аснове перадавой агратэхнічнай і ветэрынарна-заатэхнічнай навукі. Шлях да хуткага выканання пастановы лютаўскага Пленума ляжыць толькі праз яе.

За мінулы год вобласць значна павялічыла ўнясенне ў глебу мясцовых і мінеральных угнаенняў, расшырыла папаравы клін, павялічыла колькасць зябліва, прыменене на ўгнаенне любіну. Больш, чым на 35 тысяч гектараў сяўба была праведзена па ўгноеных глебах. Палепшылася калгаснае насенняводства. На месцах навучыліся аналізаваць і абагульваць вынікі сваёй работы, укараняць вопыт перадавікоў. Разгарнулася агразаатэхнічная вучоба.

Праведзена вялікая работа па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў шляхам ліквідацыі меўшых месца парушэнняў Статута сельгасарцелі, палепшанню арганізацыі і аплаты працы калгаснікаў, прымяненню правільных норм выпрацоўкі і больш дыферэнцыяваных спосабаў аплаты працы. Звеннявая сістэма, індывідуальная здзельшчына знайшлі сваё шырокае прымяненне і становяцца асноўнай арганізацыі працы ў грамадскай гаспадарцы. Прыклад калгаса імя Сталіна, Васілевіцкага раёна, дзе ажыццёўлен пераход да суцэльнай арганізацыі звеннявой сістэмы працы шырока ўкараняецца ў многіх калгасах вобласці.

На месцах вядзецца вялікая работа па ўкараненню новых форм працы. Пярвічная партыйная арганізацыя калгаса імя

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы